Фінікійскі алфавіт складаўся з 22 літар. Цікава ведаць: мы з вамі пішам злева направа, а фінікійцы — наадварот. Пазней грэкі дадалі да алфавіта і галосныя літары.

— А зараз мы пабываем на «Археалагічных раскопках». Вось дакумент таго часу, але вы бачыце, што ён пашкоджаны, і мы паспрабуем яго рэстаўраваць.

— Наша падарожжа завяршылася. Нягледзячы на тое, што краіны Фінікіі ўжо няма, памяць аб ёй жыве да сённяшніх дзён. Фінікійцам мы абавязаны назвай нашага кантынента — Еўропа. Так звалі, згодна з легендай старажытных грэкаў, дачку фінікійскага цара. Аднойчы Еўропа гуляла на беразе мора. Бог Зеўс, уражаны яе прыгажосцю, прыняў воблік белага быка і прапанаваў ёй праехацца з ім. Еўропа села на спіну быка, але той раптоўна кінуўся ў мора і хутка адплыў ад берага. Ён даплыў да вострава Крыт. Еўропа стала жонкай Зеўса і нарадзіла яму трох сыноў. Імем Еўропы сталі называць заходнюю частку Міжземнамор'я, а затым і ўвесь кантынент. Слова «Еўропа» перакладаецца як «заходзячае сонца».

***IV. Замацаванне.***

**1. Краіна, размешчаная на ўсходнім узбярэжжы Міжземнага мора:** а) Іран; б) Фінікія; в) Егіпет.

**2. Фінікійцы славіліся вырабам фарбы. Гэта:** а) пурпур; б) чорная; в) зялёная.

**3. Алфавіт фінікійцаў складаўся з ________ літар:** а) 11; б) 22; в) 23.

**4. Найбуйнейшая калонія Міжземнага мора:** а) Карфаген; б) Фівы; в) Сідон.

**5. Якому слову далі пачатак дзве літары «алеф» і «бэт»:** а) клінапіс; б) калонія; в) алфавіт?

**6. Буйны партовы горад, які ўзнік у III тыс. да н. э.:** а) Акад; б) Цір; в) Мемфіс?

**7. Фінікійцы праславіліся як умелыя будаўнікі. Што яны пабудавалі:** а) карабель; б) дом; в) дарогу?

**8. Фінікійцы першымі пачалі вырабляць:** а) штучнае арашэнне; б) шкло; в) клінапіс.

**9. Якая сучасная дзяржава размешчана на тэрыторыі Фінікіі:** а) Ліван; б) Беларусь; в) Індыя?

***V. Рэфлексія.***

Мне больш за ўсё запомнілася________________________________________________.

Гэта асабліва мяне зацікавіла________________________________________________.

Адно пытанне, якое мяне хвалюе________________________________________________.

***VI. Дамашняе заданне:*** § 22. Прыдумайце герб Фінікіі.

# Горад у IX — сярэдзіне XIII стагоддзя

**Урок гісторыі, VI клас**

**А. Г. Пляўга**

**Мэты ўрока:**

• сфарміраваць агульнае ўяўленне аб сярэдневяковым горадзе, пазнаёміць са знешнім выглядам гарадоў, шляхамі ўзнікнення, роляй гарадоў у грамадскім жыцці;

• развіваць цікавасць да мінулага нашага краю, уменне вылучаць галоўнае ў матэрыяле, які вывучаецца;

• выхоўваць цікавасць да гістарычнага мінулага беларускай зямлі.

**Тып урока:** урок тлумачэння новага матэрыялу.

**Від урока:** камбінаваны з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі.

**Абсталяванне:** Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з бел. мовай навучання / Г. В. Штыхаў, С. М. Цемушаў. — Мінск 2009; *Ракуць В. Р.* Нашы гарады / В. Р. Ракуць. — Мінск, 1990; карта Беларусі, карткі з заданнямі, мультымедыйны праектар, музычнае суправаджэнне.

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

**Ход урока**

***I. Арганізацыйны момант.***

**Настаўнік (*чытае верш*).**

Я шчаслівая тым,
што ўзрасла і жыву ў Беларусі
і што продкаў маіх
тут калыска спрадвек і спачын.
Я багатая тым,
што вялікую спадчыну маю...

**Раіса Савіч**

— Так, продкі нам пакінулі багатую спадчыну. На ўроках гісторыі мы з вамі пастаянна звяртаемся да яе. Сёння мы працягнем падарожжа па яе шматлікіх старонках. У цэнтры нашай увагі — старажытны беларускі горад. У кожнага горада свой непаўторны твар, свае здабыткі.

**Гарады Беларусі...
Кожны з іх, —
Кропля люстэрка,
у якіх адбіваецца
ўся няпростая гісторыя
нашага роднага краю.**

**У. Караткевіч**

***II. Новы матэрыял.***

— Тэма нашага ўрока, як вы ўжо здагадаліся, «Горад у IX — сярэдзіне XIII стст.». Які перыяд у гісторыі ахоплівае дадзены перыяд? Як вы думаеце, якія задачы мы перад сабой ставім? *(Адказы вучняў.)*

— Сапраўды, мы з вамі даведаемся, што такое горад, як ён выглядае, якую ролю выконваў.

А ці былі заўсёды гарады? Што ўзнікла раней — селішча або горад? Чым яны адрозніваюцца? Як вы лічыце, ці патрэбны нам былі гарады, і чаму, на вашу думку, яны пачалі ўзнікаць? *(Адказы вучняў.)*

**Горад — першапачаткова ўмацаванае паселішча; пазней адміністрацыйны, прамысловы, гандлёвы і культурны цэнтр. Назва «горад» паходзіць ад слоў «гарадзіць», «абгароджваць»**

**Гарады ўтвараліся як цэнтры рамяства і гандлю, адміністрацыйныя цэнтры, рэлігійныя і культурныя цэнтры, абарончыя пункты.**

**Дома выканайце творчае заданне: складзіце план сярэдневяковага горада. Зараз мы пачуем, як вы яго ўяўляеце. *(Адказы вучняў.)***

**— Такім старажытны горад уявілі вы, а зараз мы даведаемся, які ён быў на самай справе. У гэтым нам дапаможа невялічкае апавяданне, якое я вам прачытаю. Уважліва слухайце і занатоўвайце асноўныя прыметы горада.**

Аднойчы раніцай адправіўся сярэдневяковы селянін у горад і ў першы раз узяў з сабой свайго сына. Хлопчык нёс кошык з яйкамі, бацька ў сваім вялікім кошыку нёс муку, масла і некалькі скураў. Да горада было больш за 4 гадзіны хадзьбы пешшу. Нарэшце яны ўбачылі перад сабой вежы горада. Сын усхвалявана закрычаў: «Тата! Так многа вежаў і стрэх я яшчэ ніколі не бачыў. Цяпер я ведаю, што такое горад! Там, дзе жыве многа людзей, гэта і ёсць горад». «Не, — запярэчыў яму бацька, — гэта не зусім так. Колькасць людзей — гэта не галоўнае. Горад павінен мець сцяну, свой суд і сваю ратушу. Тады ён можа называцца горадам. Акрамя таго, кожны горад мае рынак, які знаходзіцца паблізу вялікай гарадской царквы, сабора».

*Адказы вучняў. Затым яны разглядаюць картасхему сярэдневяковага горада.*

— Мы з вамі ўжо ведаем, як выглядаў сярэдневяковы горад. Заплюшчыце вочы і ўявіце сябе ў такім горадзе. Пройдзем па яго вуліцах, зазірнём у царкву, на рынак, дзе так многа людзей. Яны размаўляюць, а мы слухаем. Затым пройдзем да дзядзінца, выйдзем за сцены горада, падыдзем да рэчкі, паслухаем шум і звон ручая. А мы з вамі дружна крочым па гэтым прыгожым месцы... А хто мне скажа, колькі на сённяшні дзень у Беларусі гарадоў? (Звыш 100.)

— У Сярэднявеччы налічвалася каля 30 гарадоў. Будаваліся яны ў розны час, таму і ўзрост іх розны.

— Перад вамі стужка часу, на якой нанесена большасць гарадоў. Мы размежавалі іх па часе ўзнікнення: IX, X, XI, XII, XIII стст. Аднак наша стужка не завершана. Дома кожны з вас павінен быў знайсці матэрыял па адным са старажытных гарадоў, і зараз гэтыя звесткі мы паслухаем. Пасля вашых адказаў кожны з вас размесціць горад на стужцы часу. *(Адказы вучняў.)*



gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

— Што атрымалася? Наша стужка пачынаецца толькі з X ст., а гарады пачалі ўзнікаць з IX ст. Мы страцілі самы старажытны горад. Які? *(Адказы вучняў.)*

*Фізкультхвілінка.*

— Упершыню горад узгадваецца ў «Аповесці мінулых часоў» у 862 г.

— Я называю горад. Калі ён старажытны — прысядаем, калі не — стаім. Той, хто памыляецца, — сядае за парту.

Віцебск, Ашмяны, Орша, Менск, Ваўкавыск, Іўе, Жабінка, Слонім, Полацк, Шчучын, Гомель, Гародня, Заслаўе, Рым.

— Мы гаварылі пра назвы гарадоў. Адкуль яны ўзніклі? Адны гарады (Полацк) паходзяць ад назвы рэк, другія называлі ў гонар князя (Заслаўе). Паспрабуем адгадаць, які горад зашыфраваны за легендай паходжання назвы.

*Работа ў парах. Кожная пара атрымлівае картку з заданнем.*

• Жыў калісьці ў той мясцовасці разбойнік Машэка, якога ў народзе звалі Львом. Калі ён загінуў, на магіле насыпалі курган, які атрымаў назву «Магіла Льва». У 1267 г. на гэтым месцы быў заснаваны горад. **(Магілёў.)**

• Ён узнік у цэнтры Тураўскага княства як гандлёвы горад. Яго хуткаму развіццю садзейнічала выгаднае размяшчэнне па гандлёвых шляхах пры зліцці ракі Піны з Прыпяццю. **(Пінск.)**

• Гэты горад заснаваны полацкім князем Барысам Усяславічам у XII ст., князь насяліў горад палоннымі і назваў яго сваім іменем. **(Барысаў.)**

***III. Замацаванне.***

1. Праверым вашы веды па прынцыпе незавершанага сказа.
2. IX—XIII стст. — гэта эпоха ... **Сярэднявечча.**
3. Назва «горад» пайшла ад слова **«гарадзіць».**
4. Умацаваны равамі, сценамі цэнтр старажытнага горада называецца ... **дзядзінец.**
5. Самым старажытным горадам з'яўляецца ... **Полацк.**
6. Колькі гарадоў Беларусі было вядома ў IX — XIII стст.? **Каля 30.**
7. Гарады Полацк, Менск аб'яднаны тым, што паходзяць ад назвы ракі________.

— Абмяняйцеся работамі і пазначце правільныя адказы.

***IV. Рэфлексія.***

**Аб чым я даведаўся?________________.**
**Мяне здзівіла______________________.**
**Больш за ўсё мяне зацікавіла__________.**
**Мяне засмуціла_____________________.**

***V. Дамашняе заданне.*** **Падрыхтуйце паведамленне пра паходжанне двух-трох старажытных гарадоў або складзіце вусна ці пісьмова апавяданне «Падарожжа па сярэдневяковым горадзе».**

# Наш край в XIII—XIV веках

**Урок истории Беларуси, VII класс**

О. Л. Бурачевская, учитель истории и обществоведения
средней школы № 40 г. Могилёва

Цели и задачи:

• *образовательные:* сформировать представление о Могилёве как составной части ВКЛ; охарактеризовать хозяйственную деятельность жителей нашего края в изучаемый период;

• *развивающие:* продолжить формировать умение работать с картографическим материалом, выделять в нём главное, существенное, развивать речь и творческое мышление учащихся;

• *воспитательные:* воспитывать чувство гражданственности, патриотизма, любви к малой родине.

Оборудование: интерактивная доска, фрагмент летописи «Повесть временных лет», карта «ВКЛ в XIII — XIV веках», компьютерная презентация (программа MS Power Point).